Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. №

КУЛЬТУРА
ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ «ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ»
WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 8 (1499)
20 лютага 2021 г.

# Вяртанне "Паўлінкі"


Фота з сайта president.gov.by

Кожны новы сезон Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы падае гледачам сваю візітную картку — дэманструе спектакль "Паўлінка" Янкі Купалы. Напрыканцы тыдня ў Купалаўскім адбылася рэпетыцыя знакамітага спектакля ў абноўленым акцёрскім складзе, на якой прысутнічаў Прэзідэнт краіны. Міністр культуры Анатолій Маркевіч расказаў кіраўніку дзяржавы аб стане спраў ва ўстанове і адраджэнні класічнага спектакля "Паўлінка".

"Значыць, у 2020 годзе мы загубілі гэты спектакль і зноў яго аднавілі? — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Цалкам? Не горш, чым было?"

"Я думаю, нават лепш", — адказаў міністр. Ён распавёў, што ў абноўленым спектаклі іграюць не толькі сталыя акцёры Купалаўскага з ранейшай трупы, але і моладзь — студэнты БДУКіМ і БДАМ. Па словах Анатолія Маркевіча, яны добра ўліліся ў калектыў: "Бачу ззяючыя вочы нашай моладзі. Яны лічаць за гонар служыць тут, у нашым тэатры, і быць побач з мэтрамі сцэны Купалаўскага. І я хачу запэўніць: гэтыя хлопцы не падвядуць ні тэатр, ні краіну".

Аляксандр Лукашэнка таксама пагутарыў з акцёрамі і запэўніў іх, што Купалаўскі быў і застанецца нацыянальным здабыткам, а яго праца будзе абавязкова адноўлена.


Сцэна са спектакля.
Фота Максіма ГУЧАКА, БЕЛТА

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Суботнія сустрэчы

## СКАРБЫ МАТЧЫНАЙ МОВЫ



21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. З гэтай нагоды "К" пагутарыла з прадстаўніком Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Вольгай Міцкевіч. ст. 6

Форум

## "КНІГА АБ'ЯДНОЎВАЕ ЛЮДЗЕЙ І КРАІНЫ"



Пад такім дэвізам працуе XXVIII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, на якой дэманстравалі свае дасягненні ў кнігавыдавецкай дзейнасці шмат краін свету і, безумоўна, Беларусь. ст. 7

Погляд з XXI стагоддзя

## "РАНЕЙ ТУТ УСТАВАЛА ЗЯМЛЯ НА ДЫБКІ..."



18 лютага споўнілася б 99 гадоў з дня нараджэння народнага мастака БССР і СССР Міхаіла Савіцкага. Як 19-гадовы хлопец з Беларусі, у будучым — сусветнавядомы мастак, стаў удзельнікам гераічнай Севастопальскай эпапеі, — пра ўсё гэта распавядае "К" на сваіх старонках. ст. 15

9 771994 478007 21008

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ